**Библиографический список**

1. Асташов, А.Б. Война как культурный шок / А.Б. Асташов // Военно-историческая антропология: ежегодник. — М.: РОССПЭН, 2002. С. 268—281.
2. Из первых уст. Великая Отечественная война глазами очевидцев / сост. А.В. Кулагина, Л.Ф. Миронихина, Г.А. Шепелев. — М.: Гос. респ. центр рус. фольклора, 2010. — 424 с.
3. Сухова, О.А. История повседневности Первой мировой войны: методология и источники / О.А Сухова // Вестн. архивиста. — 2014. — № 3. — С. 35—48.
4. Сванидзе, М. Исторические хроники с Николаем Сванидзе: в 2 кн / М. Сванидзе. — Кн. 1: 1913—1933 гг. — СПб.: Амфора, 2007. — 437 с.
5. Мировые войны XX в. в 4 кн. — М.: РОССПЭН, 2002. — Кн. 2: Первая мировая война: документы и материалы / отв. ред. В.К. Шатило. — 581 с.
6. Миронов, Б.Н. Благосостояние населения и революции в имперской России. XVIII — начало XX века / Б.Н. Миронов. — М.: Весь Мир, 2012. — 848 с.
7. Человек и война. Война как явление культуры / под ред. И.В. Нарского. — М.: АИРО-XX, 2001. — 480 с.
8. Экшут, С.А. Повседневная жизнь российской интеллигенции от эпохи Великих реформ до Серебряного века / С.А. Экшут. — М.: Молодая гвардия, 2012. — 428 с.

**Бурачонак Аляксандр Вячаслававіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# СТАНОВІШЧА ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКОВЫ ПЕРЫЯД ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

За перыяд з другой паловы XIX да пачатку XX ст. прадпрымальнікі беларускіх губерняў дасягнулі значных поспехаў, а пэўныя прадстаўнікі дзелавой эліты Беларусі ў перадваенныя гады нават складалі канкурэнцыю прадпрымальнікам цэнтральных губерняў Расійскай Імперыі. Аднак Першая сусветная вайна цалкам змяніла эканамічную сітуацыю, што склалася за парэформенныя дзесяцігоддзі на тэрыторыі Беларусі. З самых першых дзён вайны на большасці прамысловых прадпрыемстваў быў зменшаны аб'ём вытворчасці. Асноўнымі прычынамі скарачэння былі цяжкасці ў збыце прадукцыі і атрыманні новага абсталявання, а таксама недахоп сыравіны [7, арк. 5 адв. —

6 адв.]. Шмат у чым гэта было выклікана той акалічнасцю, што з аб'яўленнем усеагульнай мабілізацыі многія чыгуначныя станцыі спынілі прыём і адпраўленне прыватных грузаў. Акрамя таго, уладары прадпрыемстваў страцілі частку кваліфікаваных працоўных, якія былі мабілізаваны ў армію [2, с. 275]. У выніку гэта прывяло да таго, што ў першыя месяцы Першай сусветнай вайны каля 20 % усіх дзеючых на тэрыторыі Беларусі прамысловых устаноў спынілі працу [8, с. 90]. У заняпадзе апынуліся ўладальнікі цагляна-кафляных, шкларобчых, вінакурных прадпрыемстваў, іншыя ж пачалі пераводзіць вытворчасць сваіх фабрык і заводаў на ваенныя рэйкі. Металаапрацоўчыя заводы Беларусі сталі выпускаць узбраенне, боепрыпасы, транспартныя сродкі і г. д. Так, сярод прадпрыемстваў Мінска налічвалася пяць металаапрацоўчых заводаў, якія займаліся выпускам ваеннай прадукцыі. Безумоўна, на патрэбы фронту працавалі прадпрыемствы і іншых галін прамысловасці, сярод якіх гарбарныя, абутковыя, прадзільныя, ткацкія фабрыкі і заводы. Варта адзначыць, што, дзякуючы вайсковым заказам, гаспадары названых прадпрыемстваў на пэўны час здолелі палепшыць сваё становішча ў прадпрымальніцкай іерархіі Беларусі. Так, у лістападзе 1914 г. колькасць рабочых на льнапрадзільнай фабрыцы «Дзвіна» павялічылася на 22 %, актывізаваліся суконныя фабрыкі Слонімскага павету, якія ў даваенны час не з'яўляліся лідарамі па вытворчасці і збыту прадукцыі. Павялічыў вытворчасць і Віцебскі гарбарны завод Струнскіх і Салавейчыка [2, с. 276]. Побач з тым, некаторыя з прадпрымальнікаў Беларусі амаль цалкам перапрафіліравалі свае прадпрыемствы з мэтай далейшага атрымання сталага прыбытку з іх. Напрыклад, па такому шляху пайшоў вядомы мінскі вытворца шпалераў К. Кантаровіч. Ён быў у ліку чатырох фабрыкантаў Мінскай губерні, якія ў пачатку Першай сусветнай вайны не толькі не скарацілі вытворчасць на сваіх прадпрыемствах, але і павялічылі яе [7, арк. 4]. Яшчэ ў пачатку 1914 г. прадпрымальнік пашырыў профіль свайго прадпрыемства, калі на ім былі дадаткова адкрыты пякарны і сухарасушыльны заводы [3, арк. 205]. Апошнія запяспечвалі патрэбы арміі ў сухарах. Акрамя гэтага, у пачатку вайны спынілі працу папяровыя фабрыкі І. Франашака ў Варшаве і «Маркусфельд і Ко» ў Чэнстахове, якія ў вялікіх аб'ёмах выраблялі папяросную паперу. У сувязі са зменай сітуацыі на рынку К. Кантаровіч, які застаўся адзіным буйным пастаўшчыком гэтай прадукцыі ў Заходнім рэгіёне, павялічыў кошт папяроснай паперы на 40 % [6, арк. 8—10]. Але, нягледзячы на ўсе захады з боку прадпрымальніка, у студзені 1916 г. фабрыка спыніла сваё існаванне [4, арк. 210]. Усяго ж у канцы 1914 г. заказы ваеннага ведамства

ў беларускіх губернях выконвалі 217 прадпрыемстваў. Выпускам абароннай прадукцыі былі заняты дзве трэці рабочых цэнзавай прамысловасці [3, с. 441].

Змены, якія адбыліся ў эканамічным жыцці беларускіх рэгіёнаў, закранулі не толькі прамысловых прадпрымальнікаў, але і гандляроў. Перш за ўсё значна скараціўся аб'ём гандлёвых аперацый лесам, што было звязана з закрыццём заходніх рынкаў і змяншэннем попыту на яго ў паўднёвых губернях Расійскай Імперыі. Разам з тым адбылося скарачэнне аб'ёмаў экспартнага гандлю льном. Апошняе не мела ў параўнанні з лясным гандлем такіх катастрафічных маштабаў, паколькі існаваў вялікі попыт на льняную сыравіну з боку Маскоўскага прамысловага раёну. Тым не менш гандлёвыя абароты льну толькі ў Віцебскай губерні скараціліся ў 2,5 разы — з 12,5 млн руб. у 1914 г. да 5 млн руб. у 1915 г. [5, с. 34—35].

Змены адбыліся і ва ўнутраным гандлі. Змяншэнне попыту мясцовага насельніцтва кампенсавалася павелічэннем спажывецкага попыту вялікай колькасці бежанцаў і вайскоўцаў. Больш актыўна сталі гандляваць мясам, тытунём, збожжам і жалезам, паколькі попыт на дадзеную прадукцыю значна ўзрос. У цэлым жа ёмістасць унутранага рынку Беларусі на мяжы 1914—1915 гг. павялічылася [8, с. 268; 5, с 35].

Ажыўленне прамысловасці ў беларускіх губернях, якое назіралася ў пачатку 1915 г., ужо вясной было паралізавана наступленнем немцаў. Змены ў ходзе ваенных дзеянняў падштурхнулі расійскія ўлады зрабіць захады да рэарганізацыі кіравання народнай гаспадаркай. У жніўні 1915 г. былі створаны надзвычайныя органы кіравання эканомікай — пастаянна дзеючыя Асобыя нарады па абароне, па паліве, па харчаванні і па перавозках, якія мелі свой апарат на перыферыі. Аднак гэтыя меры былі запозненымі, паколькі варожыя войскі ўжо актыўна наступалі на тэрыторыі Беларусі. На некалькі месяцаў раней за ўрад прадпрымальнікі пачалі ствараць свае грамадскія органы для каардынавання прадпрымальніцкай дзейнасці па мабілізацыі эканомікі на патрэбы вайны. Менавіта з гэтай мэтай у маі 1915 г. быў заснаваны Цэнтральны ваенна-прамысловы камітэт, які ўзначаліў лідар партыі акцябрыстаў А. Гучкоў. Ужо ў сярэдзіне 1915 г. у Бабруйску, Беластоку, Вільні, Віцебску, Гродне, Магілёве, Мінску, Слоніме, Пінску і Полацку дзейнічалі мясцовыя ваенна-прамысловыя камітэты. У іх уваходзілі прамыслоўцы, банкаўскія дзеячы, прадстаўнікі тэхнічнай інтэлігенцыі. У ліпені 1915 г. на з'ездзе мясцовых камітэтаў у Вільні быў заснаваны Паўночна-Заходні абласны Ваенна-прамысловы камітэт. Ён распаўсюджваў свой уплыў на фабрыкі, заводы, ваенныя майстэрні, якія абслугоўвалі Заходні і

часткова Паўночны франты. Аднак у сувязі з набліжэннем фронту ваенна-прамысловыя камітэты не паспелі разгарнуць на тэрыторыі Беларусі шырокай дзейнасці па арганізацыі вытворчасці і былі пераарыентаваны на правядзенне эвакуацыі [3, с. 441—442].

Эвакуацыя прамысловых прадпрыемстваў і каштоўнага абсталявання з заходніх раёнаў Беларусі ўглыб Расійскай Імперыі пачалася летам 1915 г. Аднак асноўная хваля эвакуацыі праходзіла стыхійна і бессістэмна, з вялікімі стратамі абсталявання і гатовай прадукцыі. З заходніх абласцей Расійскай Імперыі, у тым ліку з Гродзенскай і Віленскай губерняў, ўдалося вывезці толькі асобныя фабрычна-заводскія прадпрыемствы. Так, з Гродзенскай губерні, якая з усіх беларускіх з'яўлялася адной з найбольш прамыслова развітых губерняў, здолелі эвакуіраваць толькі 12 прадпрыемстваў. Падобная сітуацыя назіралася і ў Мінскай губерні. Так, падчас эвакуацыі Парэчскай суконнай фабрыкі Скірмунтаў да яе ўжо далятала варожая шрапнель. У асноўным беларускія прамысловыя прадпрыемствы вывозіліся ў цэнтральныя і паўднёвыя губерні Расійскай Імперыі. У Маскву былі эвакуіраваны чыгуналіцейныя і машына-будаўнічыя заводы Таварыстваў «Тэхнолаг» і «Энергія», у Яраслаўль — чыгуналіцейны і машынабудаўнічы завод Таварыства «Якабсон, Ліўшыц і Ко», у Харкаў — чыгуналіцейныя і машынабудаўнічыя заводы Таварыства М. Майзэль і М. Шлапак і завод Г. Янішэўскага. Асобныя прадпрыемствы былі перавезены ў Самару, Царыцын, Растоў-на-Доне, Цвер і Славянск. Усяго за гады вайны з тэрыторыі Беларусі былі вывезены або дэманціраваны 432 прадпрыемствы, частка з якіх так і не была рээвакуіравана [1, с. 136—137, 139, 141].

Такім чынам, пачатак Першай сусветнай вайны з'яўляўся для прадпрымальнікаў на тэрыторыі Беларусі своеасаблівай «рысай», якая была пастаўлена пад некалькімі дзесяцігоддзямі актыўнай эканамічнай дзейнасці. Фактычна ў жніўні 1914 г. скончыўся адзін з найбольш насычаных перыядаў у гісторыі беларускага прадпрымальніцтва. Безумоўна, некаторыя праявы прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі назіраліся і ў гады Першай сусветнай вайны. Аднак гэта была хутчэй спроба прадпрымальнікаў выжыць, чым атрымаць сталы прыбытак са сваіх гандлёва-прамысловых прадпрыемстваў.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Бабков, А. Эвакуация промышленности Беларуси в годы Первой мировой войны / А. Бобков // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства: матэрыялы III Міжнар. кангр. беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу

цывілізацый» / рэдкал.: В. Скалабан (гал. рэд.) [і інш.] — Мінск: Беларус. кнігазбор, 2001. — С. 135—141.
2. Белявина, В.Н. Беларусь в годы Первой мировой войны / В.Н. Белявина. — Минск: Беларусь, 2013. — 396 с.
3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: Экаперспектыва, 2007—2011. — Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай Імперыі. (канец XVIII — пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. — 2007. — 519 с.
4. Дело по надзору за выполнением фабричного законодательства на обойную фабрику Конторовича // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Фонд 311. — Воп. 1. — Спр. 119.
5. Михневич, Л.М. Торговля Белоруссии (1900—1970 гг.) / Л.М. Михневич. — Минск: Наука и техника, 1973. — 222 с.
6. Переписка Киевского отдельного акционерного общества «Байер и К°» с обойной фабрикой Конторовича К.М. в г. Минске и др. лицами о технологии производства лаков, красок и рецепты их для обойной глянцевой бумаги // Центральный государственный исторический архив Украины в Киеве. — Фонд 1724. — Воп. 1. — Спр. 276.
7. Список фабрик и заводов, сократившых производство с 20 июля по 1 ноября 1914 г. // НГАБ. — Фонд 311. — Воп. 1. — Спр. 72.
8. Экономика Белоруссии в эпоху империализма (1900—1917) / под ред. Г.Т. Ковалевского [и др.]. — Минск: Изд-во АН БССР, 1963. — 420 с.

**Алиева Людмила Владимировна**
*Псковский государственный университет (Псков, Россия)*

# ТРАНСФОРМАЦИЯ СОЦИАЛЬНОГО ПРОСТРАНСТВА ПСКОВСКОЙ ГУБЕРНИИ ВСЛЕДСТВИЕ ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ

Первая мировая война стала важнейшим фактором трансформации социального пространства всех воюющих стран. Не являлась исключением и Российская империя, включая все ее регионы, в том числе и Псковскую губернию. Одним из показателей произошедшей трансформации являются данные о поголовье скота, собранные в ходе первой выборочной 10-процентной сельскохозяйственной переписи 1919 г. в России, содержащиеся в статистических картах обследований крестьянских хозяйств ряда уездов Псковской губернии (в частности, Новоржевского, Островского, Опочецкого, Порховского и Торопецкого).